Виктор Харлампиевич Буйницкий сейчас, в последние минуты героического дрейфа, загружен по горло. Он готовит к доставке на родину свой груз—материалы научных наблюдений, собранные в долгие дни дрейфа.

26 месяцев самоотверженно и мужественно трудился во льдах Арктики молодой советский гидролог Буйницкий. Он совершил научный подвиг во имя своей родины.

И. СЕМЕНОВ.
(«Известия»)

16 СТУДЗЕНЯ ШКОЛЫ ПАЧЫНАЮЦЬ ПРАЦАВАЦЬ ПА СОВЕЦКАЙ СІСТЭМЕ

БУДЗЕМ ВЫХОЎВАЦЬ ПАТРЫЁТАЎ СОЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ РАДЗІМЫ

„Усеагульнае навучанне", „творчая школа", „радасная школа" і г. д. — гэта былі лозунгі і фразы без зместу і значэння ў фашысцкай Польшчы. Усеагульнае абучэнне — чаму? Толькі чытанню, бо толькі адзінкі навучыліся граматна пісаць і авалодалі 4 арыфметычнымі дзеяннямі. Я гавару аб горадзе, у вёсцы-ж не было і гэтага. Зваротная непісьменнасць шырокіх сялянскіх мас была суцэльнай. А сяляне-ж складалі 73 проціанты ўсяго насельніцтва Польшчы. Калі мы да гэтага дадазім звыш мільёна дзяцей па за школай і вялікую колькасць дзяцей, не скончыўшых школ у горадзе, то будзем мець малюнак „усеагульнасці" абучэння на тэрыторыі былой Польшчы. Такім „усеагульным" абучэннем былі ахоплены дзеці да 14 год. Далей маглі вучыцца толькі дзеці маёмасных класаў.

Цяпер усё змянілася. Пачатковыя школы і гімназіі з ліцэямі рэканструіруюцца ў сярэднія школы. Пасля сканчэння сярэдняй школы кожны, хто хоча далей вучыцца, можа паступіць у вышэйшую навучальную ўстанову. Вышэйшая совецкая школа бясплатная. Больш таго, студэнтам будуць плаціць стыпендыю. Гэта права на асвету забяспечваецца артыкулам Сталінскай Канстытуцыі: „Кожны грамадзянін мае права на асвету".

Гэтыя новыя ўмовы і магчымасці сапраўды ўсеагульнага навучання павінны перамяніць і метады работы ў школах як настаўнікаў, так і вучняў. Метады работы ў школе павінны быць і будуць соцыялістычнымі.

Настаўнікі, якія сур'ёзна і чэсна адносяцца да сваёй работы, будуць старацца выхоўваць гэтыя рысы і ў сваіх вучняў. Гэту задачу аблегчыць самаадукацыя, павышэнне свайго ідэйнага і агульнаадукацыйнага ўзроўню. Настаўнікі вывучаюць ужо беларускую мову і літаратуру, Канстытуцыю СССР. На спецыяльнай канферэнцыі мы пазнаёміліся з вучэбнай праграмай совецкай школы. Мы вывучаем зараз у групах або індывідуальна творы Маркса — Энгельса — Леніна — Сталіна, гісторыю ВКП(б). Так авалодаўшы самі марксізмам - ленінізмам, настаўнікі змогуць выхоўваць і вучняў у духу комунізма.

Дапамагаць настаўніцтву будзе соцыялістычнае спаборніцтва як між вучнямі, класамі, так і паміж школамі. Яно дасць імпульс больш слабым і адсталым вучням падцягнуцца ў навуцы, а настаўнікам дабіцца лепшых вынікаў у сваёй працы. Гэта будзе сапраўды творчая і радасная работа.

Перад настаўніцтвам стаяць вялікія задачы. Кожны прадмет, кожны ўрок павінен быць прасякнут ідэалогіяй комунізма, вялікімі ідэаламі чалавецтва, за якія пакутуюць яшчэ мільёны людзей у капіталістычных краінах.

Дапамогу ў выхаванні нашых вучняў акажа стварэнне гурткоў мастацкай самадзейнасці, развіццё здольнасцей і талентаў вучняў. Не прападуць больш таленты, як гэта было раней з „Янкам-музыкантам".

Мы будзем выхоўваць для соцыялістычнай дзяржавы дысцыплінаванага, адукаванага грамадзяніна, свядомага і вернага патрыёта сваёй соцыялістычнай радзімы.

М. Бархаш,
настаўнік 8-й школы Беластока.

ПАКАЗАЛЬНЫЯ ЛІЧБЫ

У Гродненскім павеце было 212 школ, з іх 189 польскіх, 15 літоўскіх, 8 яўрэйскіх, ні адной беларускай і ні адной рускай.

Цяпер у павеце 258 школ, з іх 223 беларускіх, 15 літоўскіх, 9 польскіх, 8 яўрэйскіх і адна руская. На адбыўшыхся бацькоўскіх сходах працоўныя беларусы з радасцю галасавалі за тое, каб выкладанне ў школах вялося на роднай, беларускай мове.

Такім чынам, за месяцы совецкай улады колькасць школ у адным толькі Гродненскім павеце павялічылася на 46. Калі раней у школах навучалася 28.364 вучні, то зараз колькасць вучняў дасягнула 32 012. Колькасць настаўнікаў павялічылася з 440 да 1099.

ШАСЦІДЗЁНКА Ў ШКОЛАХ

Пастановай горвыканкома ў беластоцкіх школах уводзіцца шасцідзёнка. Рабочы тыдзень — 5 дзён. Выхадныя — 6, 12, 18, 24 і 30 кожнага месяца.



На здымку: Група дзяцей першай рускай совецкай школы ў г. Беластоку (Фото Сапір).

ВУЧНЁЎСКІЯ АРГАНІЗАЦЫІ Ў ШКОЛЕ

З'яўляючыся формай дзіцячай самадзейнасці, вучнёўскія арганізацыі дапамагаюць настаўнікам у выхаванні свядомых, чэсных і адданых справе працоўных грамадзян соцыялістычнай радзімы.

Ужо ў малодшых класах трэба актывізаваць дзяцей, уцягваць іх у грамадскае жыццё школы. Дзяжурствы вучняў па класу і школе з'яўляюцца адной з форм такой актывізацыі. Настаўнік уцягвае ўсіх вучняў у соцспаборніцтва, мабілізуе іх на ўпрыгожанне класа, на падрыхтоўку школьных ранішнікаў, на правядзенне экскурсій і прагулак; вядуць працэйшы календар надвор'я і г. д.

Пачынаючы з 5 класа, на агульным класным сходзе выбіраецца класны арганізатар з ліку лепшых аўтарытэтных вучняў тэрмінам на вучэбнае паўгоддзе. Класны арганізатар працуе пад кіраўніцтвам класнага кіраўніка і вучнёўскага камітэта і трымае цесную сувязь з советам піонерскага атрада класа, а ў 8—10 класах — з комсамольскімі групоргамі.

Работа класнага арганізатара разнастайная. Ён дабіваецца дакладнага выканання ўсімі вучнямі ўстаноўленага распарадку школы, устанаўлівае дзяжурствы вучняў, арганізуе пад кіраўніцтвам настаўніка таварыскую ўзаемадапамогу адстаючым вучням класа, дапамагае класнаму кіраўніку ў арганізацыі і праверцы соцыялістычнага спаборніцтва, уцягвае вучняў свайго класа ў работу пазашкольных гурткоў, у лік чытачоў школьнай бібліятэкі і г. д. Для абмеркавання паспяховасці і дысцыпліны класа, для праверкі ходу соцспаборніцтва класны арганізатар праводзіць класныя вучнёўскія сходы, а ў канцы вучэбнай чвэрці робіць справаздачу аб сваёй рабоце.

Вучнёўскі камітэт выбіраецца на агульным сходзе вучняў у колькасці 5—7 чалавек з ліку лепшых актыўных і аўтарытэтных вучняў тэрмінам на вучэбнае паўгоддзе. Вучнёўскі камітэт арганізуе соцыялістычнае спаборніцтва вучняў за добрую і выдатную вучобу, за ўмацаванне свядомай дысцыпліны і сістэматычна правярае выкананне ўзятых вучнямі абавязацельстваў. На сваіх пасяджэннях вучком абмяркоўвае з удзелам дырэктара школы мерапрыемствы па паляпшэнню вучобы і дысцыпліны сярод вучняў, выклікае на пасяджэнне адстаючых, недысцыплінаваных вучняў і г. д. Пад кіраўніцтвам вучкома працуюць агульнашкольныя гурткі, добраахвотныя таварыствы і класныя арганізатары.

Разам з комсамольскай і піонерскай арганізацыямі вучком выдае агульнашкольную насценную газету і журналы, падрыхтоўвае і праводзіць рэволюцыйныя святы, вечары самадзейнасці, арганізуе абаронную і фізкультурную работу сярод вучняў.

Па запрашэнню дырэктара школы прадстаўнікі вучкома прымаюць удзел на пасяджэннях педагагічнага совета.

Выбары вучкомаў і класных арганізатараў у школах нашай абласці будуць праходзіць у перыяд з 16 па 25 студзеня.

У застаўшыеся дні трэба правесці вялікую растлумачальную работу сярод вучняў аб ролі і значэнні вучнёўскіх арганізацый у школе. Комсамол павінен правесці выбары вучнёўскіх арганізацый на высокім узроўні.

Тэляс.

НА БАЦЬКОЎСКІХ СХОДАХ

ПЕРШАЯ ШКОЛА

У прасторным клубе першай школы сабраўся 10 студзеня многалюдны бацькоўскі сход, прысвечаны рэарганізацыі школ. З дакладам аб задачах совецкай школы выступіў выконваючы абавязкі загадчыка Горана тав. Фешчэнка.

— З 16 студзеня, — гаворыць тав. Фешчэнка, — абучэнне ва ўсіх школах заходніх абласцей БССР пераводзіцца на совецкую сістэму.

Дакладчык пазнаёміў прысутных са структурай совецкай школы і парадкам рэарганізацыі. На словы дакладчыка аб тым, што па вялікай Сталінскай Канстытуцыі для ўсіх грамадзян СССР прадастаўлена права на бясплатную не толькі пачатковую, але і вышэйшую асвету на роднай мове, зал адказаў дружнымі апладысментамі.

— Кожны малады грамадзянін нашай радзімы, — гаворыць дакладчык, не толькі мае права, але і абавязан атрымаць сярэднюю асвету. Пасля сканчэння сярэдняй школы перад выпускнікамі шырока адкрыты дзверы ў любы інстытут, у любы універсітэт. Ён можа свабодна выбіраць для сябе спецыяльнасць, развіваць свае здольнасці і талент.

Вялікае задавальненне бацькоў выклікала паведамленне аб тым, што першая школа з былой „паўшэхнай" рэарганізуецца ў поўную сярэднюю школу з 26 класамі, прычым у школе будзе ажыццяўлена сумеснае навучанне хлопчыкаў і дзяўчынак.

У разгарнуўшыхся пасля даклада спрэчках большасць выступаючых горача вітала совецкую сістэму абучэння і выхавання падрастаючага пакалення, яны расказвалі аб тым, як цяжка было прабіцца ў навуку дзецям працоўных ва ўмовах былой панскай Польшчы, як дзяцей пічкалі ў школах розным хламам.

Бацькоўскі сход даў рашучы адпор выступленню грамадзяніна Осетынскага, які прапанаваў... адкласці ўвядзенне совецкай сістэмы ў школах да восені.

Страсна і шчыра гаварыў на сходзе інжынер Карпінскі. Яго палкая прамова была выслухана з цікавасцю і адабрэннем большасці прысутных. Яна часта перапынялася апладысментамі.

Тав. Карпінскі гаварыў аб тым, што ў нас збыліся мары лепшых сыноў чалавецтва, што мы будуем новы свет, свет без прыгнятальнікаў, без класавай розні. Буржуазная школа, якая выхоўвала верных лакееў капіталістычнага ладу, знішчана раз і назаўсёды. Совецкая школа будзе выхоўваць будаўнікоў радаснага комуністычнага грамадства. Тав. Карпінскі гаварыў таксама аб задачах бацькоў у справе пабудовы совецкай школы.

Пасля схода група бацькоў звярнулася з просьбай да загадчыка Горана адкрыць у першай школе класы, у якіх-бы выкладанне вялося на рускай мове.

ЧАЦВЕРТАЯ ШКОЛА

10 студзеня ў 4-й пачатковай школе адбыўся агульны сход бацькоў, сазваны для абмеркавання перабудовы школ на совецкую сістэму. На сход прышло звыш 120 чалавек.

Прадстаўнік Горана тав. Бойка расказала прысутным аб сутнасці пераходу на совецкую праграму, аб структуры совецкай школы. Яна гаварыла аб вялікім будучым для дзяцей рабочых і сялян. — Пашыраная праграма патрабуе, каб дзеці вельмі сур'ёзна ўзяліся за вучобу, а ў гэтым неабходна ім дапамога бацькоў, — гаворыць тав. Бойка.

— Трэба ўявіць сабе, — сказаў у спрэчках настаўнік Царук, — што беларуская мова — гэта мова, на якой гавораць 75 процантаў насельніцтва. Ні царызм, ні панская Польшча не давалі магчымасці вучыцца на роднай мове і развіваць сваю нацыянальную культуру. Цяпер з увядзеннем у школу беларускай мовы, як прадмета, мы адкрываем дарогу да навукі эксплаатаванаму да гэтага часу беларускаму народу.

У прынятай рэзалюцыі сход ганьбуе рэакцыйную палітыку б. польскага ўрада ў справе народнай асветы, віншуе рэарганізацыю школы на совецкую сістэму і прызнае неабходным увядзенне ў школу беларускай мовы.

Новыя гарады СССР

З 1920 па 1939 г. насельніцтва СССР павялічылася на 36 млн. чалавек. За годы совецкай улады вырасла 360 новых гарадоў. Многія з іх узніклі з нязначных паселішчаў: невялікіх вёсак або хутароў. Да такіх гарадоў адносіцца Электрасталь, размешчаны ў 7 клм. на поўдзень ад Ногінска (пад Масквой). Горад узнік пасля таго, як тут быў пабудаван электраметалургічны гігант. На тэрыторыі горада, акрамя электраметалургічнага завода, знаходзіцца яшчэ 10 другіх прамысловых прадпрыемстваў. Горад электрыфікаван, ёсць вадаправод і каналізацыя. У 1938 г. тут былі ўжо дзве сярэднія і адна пачатковая школы, дзве паліклінікі, больніца, 25 магазінаў.

Шматлікую групу складаюць гарады, утварыўшыяся з вёсак і сёл, у якіх ужо і раней былі саматужныя майстэрні і невялікія фабрыкі. Вось, напрыклад, падмаскоўны горад Дзержынагорск (был. Іванцэеўка). Тут вялікая трыкатажная фабрыка з 6,5 тыс. рабочых, хлебазавод, трыкатажна - тэхнічная школа, 4 агульна-адукацыйныя школы, фабрыка-кухня і г. д.

Такіх новых гарадоў у СССР налічваецца, прыкладна, каля 200. Яшчэ адна група гарадоў узнікла з буйных паселішчаў: вялікіх сёл, слабод. Да гэтай групы адносіцца, напрыклад, Крывы Рог, да рэволюцыі — мястэчка з 15 тыс. жыхароў, а зараз буйны горад (каля 200 тысяч жыхароў).

* * *

Уздоўж паўночных акраін РСФСР працягнулася зона тундр і лесатундр. Тут, у раёне мёрзлых пустынь, якія толькі на працягу кароткага лета адтайваюць і пакрываюцца беднымі раслінамі, пасля рэволюцыі занава пабудавана 5 гарадоў: Мончэгорск, Кіраўск, Нар'ян-Мар, Салахард і Ігарка. Гэтыя гарады размешчаны на шляхах, па якіх сюды пранікаюць соцыялістычная індустрыя і культура.

Зараз у Мончэгорску ўжо больш 30 тыс. жыхароў, а яшчэ ў 1937 г. толькі адна хатка саамя (лапара) адзінока стаяла на беразе возера Мончэ. З недраў гор Мончэ-тундры дабываюцца руды.

На поўдзень ад паласы лесатундр шырока раскінулася зона хвойных лясоў. Сярод абшырных лясоў і тарфяных балот па берагах вялікіх рэк цягнуліся тут раней вузкімі ланцужкамі невялікія сёлы. Гарады сустракаліся на адлегласці соцень кіламетраў адзін ад другога. У гэтай суровай зоне з'явілася пасля Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі 34 новыя гарады: Волхаўстрой, Кайдапога, Молатаўск, Сокал, Кудымкар, Краснакамск, Тайга, Тайшэт, Тамот, Магадан і др. Усе яны размешчаны на чыгуначных або водных шляхах. Кожны з гэтых гарадоў вырас на базе соцыялістычнага скарыстання мясцовых прыродных багаццяў: лясной драўніны, сілы падзення вады, карысных выкапняў і г.д.

Заходняя частка РСФСР, Беларуская ССР і паўночны захад Украінскай ССР размешчаны ў зоне змешаных і ліственных лясоў.

З развіццём тут цяжкай прамысловасці ўзніклі 92 новыя гарады. У Беларускай ССР утварыліся гарады: Ветка, Калінкавічы, Касцюковічы, Дрыса, Крычаў, Асіпавічы. На паўночным захадзе Украінскай ССР — Малін, Каростышаў, Шостка, Фастаў.

Самы буйны новы горад ў прамысловым цэнтры РСФСР — Сталінагорск, Тульскай вобласці; гэта горад энергетыкі і хіміі, аснаваны ў 1931 годзе пры бураўгальных шахтах, цяпер у ім ужо 76 тысяч жыхароў.

Нямала гарадоў узнікла ў абласцях Іванаўскай і Горкаўскай, у Чувашскай і Татарскай АССР, на Волзе, на Далёкім Усходзе. Горад Комсамольск-на-Амуры, аснаваны ў 1932 годзе, перагнаў ужо па колькасці насельніцтва многія старыя гарады СССР.

Праз Украінскую ССР., чорназемную паласу РСФСР, Казахскую ССР, Заходнюю і Усходнюю Сібір цягнецца паласа лесастэпаў і стэпаў. Да рэволюцыі насельніцтва тут было сканцэнтравана пераважна ў буйных сёлах, размешчаных не ў саміх стэпах, дзе мала вады, а на берагах Днепра і яго прытокаў, Дона, Волгі і г. д. Гарадоў у гэтай зоне было нямнога, яны адыгрывалі ролю адміністратыўных і гандлёвых цэнтраў (Курск, Варонеж, Тамбоў і г.д.). У сувязі з развіццём розных соцыялістычных галін прамысловасці пасля рэволюцыі ў гэтай зоне паявілася 142 новыя гарады. З іх 92 прыпадае на Украінскую ССР.

Найбольш значныя з іх — Варашылаўск (каля 55 тысяч), Горлаўка (108 тысяч), Днепрадзержынск (147 тысяч), Канстанцінаўка (95 тысяч), Макееўка, Орджанікідзе, Серго і др. Аб значэнні гэтых новых гарадоў гаворыць хаця-б той факт, што Макееўскі металургічны завод выплаўляе чыгуну ў два разы больш, чым ўсе заводы былой Польшчы, разам узятыя.

У адной Сталінскай вобласці (Данбас) вырасла за гэты час 27 гарадоў, а ў Варашылаўградскай — 18. Тлумачыцца гэта, па-першае, магутным ростам прамысловасці ў УССР, асабліва ў Данбасе, і, па-другое, тым, што пры царызме ў Данбасе гаспадарылі замежныя капіталісты. Шахцёры жылі тады ў бедных, грязных пасёлках, у страшэннай цеснаце, тулячыся са сваімі сем'ямі ў маленькіх хацінках.

На месцы старых, гарняцкіх пасёлкаў — „сабачэевак" з іх падслепаватымі зямлянкамі створаны добра ўпарадкаваныя гарады з прыгожнымі жылымі дамамі, са скверамі, клубамі, стадыёнамі, палацамі культуры.

Да рэволюцыі ў раёне поўпустынь не было нават сёл і вёсак — там жылі амаль адны толькі вандроўнікі. Цяпер у гэтых раёнах жыццё ў корані змянілася. У Казахскай ССР узніклі такія новыя буйныя гарады, як Караганда (з вугальнымі шахтамі), Балхаш (з велізарным медным камбінатам), у Туркменскай ССР — Кара-Багаз-Гол (з хімічным камбінатам). У поўпустыні-ж вырасла сталіца Калмыцкай АССР — Эліота.

Асабліва вялікае значэнне маюць новыя гарады — Магнітагорск і Сталінск, якія растуць з багатырскай сілай. Аснаваныя ў 1931 і 1932 гг., ободва яны паспелі ператварыцца ў буйныя гарады з насельніцтваам каля 150 тыс у кожным.

Такіх тэмпаў развіцця не ведалі нават гарады Злучаных Штатаў у перыяды найбольшага свайго росту (у мінулым веку). Сталінск і Магнітагорск перагналі большасць старых гарадоў РСФСР, якія будаваліся стагоддзямі. У заходніх прадгор'ях Урала на нашых вачах вырастаюць новыя гарады Другога Баку — Ўшымбаева, Краснакамск і др.

На Каўказе будаўніцтва новых гарадоў развілося, галоўным чынам у трох саюзных рэспубліках — Грузіі, Азербайджане, Армянскай ССР. Многія тысячы горцаў спусціліся пасля рэволюцыі з гор, куды

(Працяг на 4 стар.)

НОВЫЯ ГАРАДЫ СССР

(Працяг)

іх загнаў царскі ўрад і дзе яны жылі сярод суровых скал і дымных аулаў. Гэтыя людзі склалі асноўную масу насельніцтва новых, а таксама і старых гарадоў. Пры гэтым магутным працэсе нацыянальнага адраджэння старая сталіца Грузіі—Тбілісі — зусім змянілася; яна ператварылася ў буйны прамыславы цэнтр, у якім амаль усё нанава перабудавана. Сучасны Тбілісі з'яўляецца адным з самых прыгожых і самых упарадкаваных гарадоў СССР.

Трэба асоба надкрэсліць, што вялікая частка новых гарадоў выраслі ў нацыянальных рэспубліках і аўтаномых абласцях, якія раней з'яўляліся калоніямі рускага царызма.

Бурнымі тэмпамі развіваюцца ў нацыянальныя рэспубліках соцыялістычная індустрыя і соцыялістынае земляроботва, растуць новыя гарады. Караганда (Казахстан) і Кара-Багаз-Гол (Туркменія), Эліота (Калмыцкая АССР) і Кандапога (Карэлія), Нар'ян - Мар (Ненецкая нацыянальная акруга) і Салахард (Осцяка-Вогульская нацыянальная акруга), дзесяткі другіх новых гарадоў — усё гэта дзецішча ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі, прылучыўшай да соцыялізма адсталыя і забітыя пры царызме народы.

Шматлікія новыя гарады, узнікшыя ў СССР, маюць велізарнае значэнне для развіцця народнай гаспадаркі і культуры ў краіне. Яны нясуць соцыялістычную культуру ў вёску. Яны пашыраюць базу для руху наперад соцыялістычнага будаўніцтва, для пераходу ад соцылізма да камунізма.

Г. І. Іваноў

—«о»—

НОВЫЯ ДЗІЦЯЧЫЯ ДАМЫ

У абласці адкрыты 23 дзіцячых дамы з агульным ахопам 1400 дзяцей. Па плану аблана намечана колькасць дзіцячых дамоў у гэтым годзе давесці да 32 з ахопам 3000 дзяцей.

З 20 студзеня адкрываецца дзіцячы дом у былым маёнтку Саламянка, Беластоцкага павета, у якім будзе 100 дзяцей, пераважна бежанцаў.

У студзені адкрыецца новы дзіцячы дом у Беластоку на „Звярынцы", разлічаны на 150 дзяцей.

НА ЗАПАДНОМ ФРОНТЕ

Несмотря на сильный холод, на западном фронте действия сухопутных и воздушных сил усилились. 12 января в воздухе находилось очень много разведывательных самолетов. Имело место несколько воздушных боев, во время которых французские истребители сбили 2 германских самолета. На суше постоянно происходят местные стычки, в которых участвуют многочисленные группы войск. Западнее Саара завязался оживленный бой пехоты французского корпуса с крупным германским отрядом.

ВОЙНА НА МОРЕ

БЕРЛИН, 12 января.

Английский танкер „Элосо" водоизмещением в 7.267 тонн с полным грузом нефти взорвался у западного побережья Англии. Танкер возвращался из 6-ти недельного рейса в Южную Америку. Оставшиеся в живых после взрыва подобраны военным кораблем. Из 36 человек экипажа танкера трое пропали без вести.

(ТАСС).

НЬЮ-ЙОРК, 12 января.

В южной части Атлантического океана германская команда потопила торговый пароход „Уссукума" (водоизмещением в 7.834 тонны) после того, как английский военный корабль обнаружил это судно.

(ТАСС).

ЛОНДОН, 12 января.

Итальянский пароход „Травиата" водоизмещением в 5.123 тонны наткнулся на мину и затонул. Команда парохода в числе 60 человек спасена.

(ТАСС).

ЛОНДОН, 12 января.

Английский пароход „Гранта" водоизмещением в 2.719 тонн наткнулся на мину и затонул вблизи восточного побережья Англии. Команда спасена.


Газета „Дейли экспресс" сообщает, что вблизи Канарских островов английский пароход „Авила стар" был атакован тремя германскими подводными лодками. С английского парохода был открыт огонь из орудия. Одна подводная лодка получила повреждения, а две другие скрылись.

БРЮССЕЛЬ, 12 января.

На 9 января в английских контрольных портах находилось 49 кораблей нейтральных стран. Из них: 22 голландских, 10 норвежских, 6 шведских, 5 бельгийских, 2 датских, 2 панамских, один итальянский и один американский. В течение недели — с 1 по 6 января — английский контроль подверг досмотру грузы 105 кораблей.

(ТАСС).

В КВАРТИРЕ ФРАНЦУЗСКОГО БЕЗРАБОТНОГО



— Скажите, подорожание масла и мяса сильно отразится на вашем бюджете?

— Совсем не отразится, господин инспектор, мы давно уже не покупаем эти продукты.

ВОЙНА В КИТАЕ

(Обзор военных действий)

Развитие военных действий в Китае за последнее время еще раз показало насколько возросла сопротивляемость китайских войск и, в то же время,—насколько упали наступательные возможности японской армии.

После занятия Ханькоу на исходе 1938 года ни одно японское наступление не достигло конечной цели. В течение 1939 года японское командование упорно стремилось отрезать китайские войска от источников их снабжения заграничным вооружением. Такую цель преследовал захват Сватоу (порт в провинции Шандунь), а также наступление на Чанша (к югу от Ханькоу), начатое в сентябре 1939 года. Развивая это наступление, японцы рассчитывали занять линию Ханькоуской железной дороги и окончательно отрезать территорию национального китайского правительства от приморских баз. Наконец, последнее неудачное наступление к северу от Кантона было также рассчитано на захват Ханькоуской железной дороги на этот раз с южного ее конца.

Все эти наступательные операции закончились неудачами. Частичные успехи на тех или иных участках фронта далеко не оправдывают понесенных японцами потерь.

Таким образом 1939 год не принес никаких существенных изменений в положении японской армии на фронтах Китая. Это несомненно отразится и на ближайших военных операциях японцев, тем более, что Япония сейчас вступила в полосу весьма серьезных экономических трудностей, вызванных затянувшейся войной.

Основные военные действия на фронтах Китая за последние дни сосредоточились на юге—в провинциях Гуанси и Гуандун. Захватив в конце 1938 г. Кантон, японцы неоднократно пытались развить наступление к юго-западу от Кантона с тем, чтобы захватить пограничную полосу провинции Гуанси, отделяющую Китай от французского Индокитая. Но все эти попытки были отбиты китайскими войсками. Высадив в конце 1939 года десант в районе Пакхоя и Синьчжоу, японцам удалось сравнительно быстро захватить Нанькин, связанный с Индокитаем шоссейной дорогой. Однако, все попытки развить наступление потерпели неудачу. Сейчас японские войска, действующие у Нанькина, фактически полуокружены китайцами.

Также провалилось и наступление японцев к северу от Кантона. Сосредоточив три дивизии, японское командование повело наступление тремя колоннами. На правом фланге японцам ценой больших потерь удалось достигнуть Вэньюаня, а на левом—Инда—на Кантон-Ханькоуской железной дороге.

Перешедшие в контрнаступление китайские войска первого января нанесли японцам сильнейшее поражение в районе Вэньюаня. Японская гвардейская бригада в треугольнике Инда— Вэньюань—Нанькин была также разгромлена. Потеряв свыше 10 тысяч человек, японцы начали паническое отступление обратно—на юг, к Кантону. В результате этой крупной победы китайских войск все последствия японского наступления были ликвидированы и японцы откатились к самому Кантону.

ГЕРМАНСКАЯ ПЕЧАТЬ О ПОПЫТКАХ АНГЛО-ФРАНЦУЗСКОГО БЛОКА СОЗДАТЬ НОВЫЕ ОЧАГИ ВОЙНЫ

Германская газета „Кельнише цейтунг" выступила со статьей об англо-французских попытках разжечь войну на севере.

Англия и Франция, пишет газета, оказывают сильный нажим на Швецию и Норвегию, стараясь заставить их оказать широкую „помощь" Финляндии.

Каждому понятно, что судьба Финляндии не беспокоит Англию и Францию, которые, вовлекая Швецию и Норвегию в войну, хотят нанести вред Германии.

Англия и Франция всеми силами пытаются создать новый плацдарм войны.

Под прикрытием фраз о „помощи" Финляндии, Англия и Франция пытаются привлечь на свою сторону нейтральные страны, которым, якобы, угрожает Германия, и создать в северных странах свои военные опорные пункты.

(ТАСС).

ПО ГОРОДУ И ОБЛАСТИ

—о—

ОКОНЧАНИЕ ПЕРВОГО ПРОБНОГО РЕЙСА ПО НОВОЙ ВОЗДУШНОЙ ЛИНИИ

11-го января в 10 час. 40 мин. утра, возвращаясь из первого пробного рейса из Берлина в Москву приземился на Белостокском аэродроме советский самолет «ДС—3».

Самолет прибыл на 10 минут раньше срока, указанного в расписании.

Летчики тт. Кириченко, Глушаев и Монахов рассказали, что в Кенигсберге и в Берлине им был оказан хороший дружеский прием. В Берлине летчики были приглашены в театр.

Пилоты тт. Хорпяков и Смирнов остались в Берлине. Они вместе с немецкими пилотами поведут германский самолет, который полетит в пробный рейс из Берлина в Москву. Вместо них на советском самолете для ознакомления с трассой полета полетели немецкие пилот и шеф-радист.

После 30-ти минутной остановки на Белостокском аэродроме — «ДС—3» вылетел в Москву через Минск.

ПРИЕЗД БЕЛОРУССКОГО ГОСУДАРСТВЕННОГО ТЕАТРА

В Белостоке на днях ожидается прибытие полного состава труппы второго Белорусского Государственного Театра в количестве 100 человек.

Выступления театра начнутся 1-го февраля.

СЕМИНАРЫ ДЛЯ УЧИТЕЛЕЙ БЕЛОСТОКСКОГО УЕЗДА

В связи с предстоящей реорганизацией школ созданы учительские семинары в 3-х пунктах уезда (Белосток, Кнышин и Михайлово).

Семинарами охвачено 350 человек.

НОЧНОЙ САНАТОРИЙ ДЛЯ ТУБЕРКУЛЕЗНЫХ

В г. Белостоке будет создан ночной санаторий для туберкулезного больного.

Система ночного туберкулезного санатория состоит в том, что больные в течении дня работают на производстве, а вечером возвращаются в санаторий, где получают полное санаторное содержание — усиленное питание, лечение и т. д.

НОВЫЕ ГОРОДСКИЕ СТОЛОВЫЕ

Работающие сейчас в городе 3 городские столовые выдают в день 1.500 обедов. В ближайшие дни в помещении б. ресторана «Бристоль» откроется 4-ая столовая.

Помещение «Люкс'а» расширяется за счет соседних магазинов и биллиардной. Новая столовая будет выдавать в день 1000 обедов. Она откроется к 1-му февраля.

КОНДИТЕРСКАЯ И КАФЕ

В Белостоке открылась городская кондитерская, в которой продаются изделия собственной продукции.

На днях на первом этаже здания гостинницы б. «Риц» откроется городское кафе.

Адказны рэдактар **Б. М. Зельманаў**

Адрас рэдакцыі і выдавецтва: г. Беласток, будынак Аблвыканкома. Тэлефоны рэдакцыі: адказнага рэдактара— 45; партаддзела і сакратарыята —47; сельскагаспадарчага, культурнага, літаратуры і мастацтва, школьнага і інфармацыйнага аддзелаў — 17-52; выдавецтва і аддзел аб'яў—35; друкарня і начная рэдакцыя 5.21. Падпіску на газету прымае Саюздрук тэл. 5.14.

Уполномоченный облліта № Е — 2

1-я дзяржаўная друкарня ў г. Беластоку.